УДК 821.161

# БАБРУЙШЧЫНА ЛІТАРАТУРНАЯ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

Малашук І. М.
Установа адукацыі «БІП – Універсітэт права і сацыяльна-інфармацыйных тэхналогій», Магілёўскі філіял
(г. Магілёў, Беларусь)

Анатацыя. Артыкул прысвечаны агляду літаратурных традыцый Бабруйшчыны. Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць выснову аб яскравым дыялогу беларускай, рускай і яўрэйскай культур, аб пераемнасці ў творчасці пісьменнікаў і захаванні духоўнай спадчыны.

Ключавыя словы: гісторыя літаратуры; нацыянальная культура; дыялог культур; літаратурныя традыцыі; духоўная спадчына.

Annotation. The article is devoted to the review of the literary traditions of the Bobruisk region. The research allows us to conclude that the Belarusian, Russian and Jewish cultures have a vivid dialogue, that the writers' creative work is consistent, and that their spiritual heritage is preserved.

Keywords: literary history; national culture; dialogue of cultures; literary traditions; spiritual heritage.

Горад Бабруйск існуе ўжо шэсць стагоддзяў, тут перапляліся дарогі мінулага і сучаснасці. На гэтай зямлі нарадзіліся, жылі і працавалі выдатныя пісьменнікі: Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Міхась Лінькоў, Пімен Панчанка, Платон Галавач, Васіль Вітка, Генадзь Шведзік, Сяргей Грахоўскі, Міхаіл Герчык, Мікола Аўрамчык, Барыс Мікуліч, Алесь Адамовіч, Эфраім Севела і інш. Гісторыя Бабруйска – яскравы прыклад дыялогу беларускай, рускай і яўрэйскай культур: будучыя дзекабрысты Сяргей Мураўёў-Апостал, Міхаіл Бястужаў-Румін, Павел Бястужаў, Міхаіл Пушчын служылі ў Бабруйскай крэпасці, лёс 14 нашчадкаў вялікага Пушкіна звязаны з Бабруйскім краем. Унучка паэта, Наталля Аляксандраўна Пушкіна (Варанцова-Вельямінава), пахавана ў вёсцы Цялуша.

Надзвычай важнае месца ў гісторыі беларускай нацыянальнай культуры належыць Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. Пісьменнік нарадзіўся ў вёсцы Панюшкавічы, дзе яго бацькі арандавалі зямлю ў пачатку XIX стагоддзя. Сваёй

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

шматграннай дзейнасцю ён вызначыў цэлую эпоху ў працэсе нацыянальнага адраджэння. Ён быў першым у беларускай літаратуры пачатку другой паловы XIX стагоддзя, хто ўзяў на сябе рашэнне даволі складанай задачы – станаўленне беларускай мовы як літаратурнай. Драматург, паэт, тэатральны дзеяч, педагог В. Дунін-Марцінкевіч аказаў вялікі ўплыў на станаўленне і развіццё новага беларускага пісьменства і сцэнічнага мастацтва. Бабруйскі гарадскі драматычны тэатр па праве носіць імя слаўнага земляка, мае статус Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі, цалкам абвяргаючы меркаванне аб мясцовым тэатры як правінцыйным. Традыцыйна калектыў тэатра адкрывае чарговы творчы сезон вядомай п'есай В. Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта».

Значнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры займае імя Міхася Ціханавіча Лынькова. Ураджэнец Віцебскай вобласці, сваю літаратурную дзейнасць ён пачаў у Бабруйску, у рэдакцыі газеты «Камуніст», цяпер – «Бабруйскае жыццё». За пяць гадоў працы ў рэдакцыі газеты ён напісаў некалькі апавяданняў, заснаваў у Бабруйску філіял літаратурнага аб'яднання «Маладняк», арганізаваў выпуск літаратурнага альманаха «Уздым».

На старонках газеты «Камуніст», пачынаючы з 1921 года, друкаваліся селькораўскія нарысы, фельетоны, апавяданні, аповесці Платона Галавача (1903 – 1937 гг.), які быў адным з кіраўнікоў літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

Вядомы дзіцячы беларускі пісьменнік Васіль Вітка (Крысько Цімох Васільевіч, 1911 – 1996 гг.) друкаваўся тут у 1928 годзе. Аўтар шматлікіх зборнікаў для дзяцей: «Вавёрчына гора» (1948 г.), «Буслінае лета» (1958 г.), «Казка пра цара Зубра» (1960 г.), «Зайчык-вадалаз» (1962 г.) і інш.

У канцы дваццатых гадоў М. Лынькоў у гэтай газеце і ў літаратурным дадатку «Вясна» надрукаваў першыя творы Барыса Мікуліча, які да гэтага спрабаваў свае сілы ў школьным літаратурна-мастацкім часопісе першай сярэдняй школы г.Бабруйска «Крок». Барыс Мікуліч развітаўся са сваёй маладосцю ў дваццаць два гады – быў рэпрэсіраваны і памёр у сорак два ўдалечыні ад Радзімы.

З Бабруйскам звязана імя паэта Генадзя Шведзіка (1914–1942 гг.), які пайшоў з жыцця ўсяго ў дваццаць восем гадоў. Салдат-кулямётчык восенню 1942 года, гледзячы на спусцелую лясную вёску ў прыфрантавой паласе, успамінаў свой родны Бабруйск, яго ціхія вуліцы і ўскраіны: «І сэрца гнеўнае салдата // Цераз агонь варожы мкне // Да беларускай роднай хаты, // Дзе радасна жылося мне. // У крыку слодыч і пакута: // Што можа сэрцу быць бліжэй, // Чым песня пеўня, што пачута // На першай лініі траншэй?» [6, 212.].

Імя Генадзя Шведзіка высечана залатымі літарамі на мемарыяльнай дошцы ў Доме літаратара, як і імёны тых пісьменнікаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Міхаіл Герчык нарадзіўся ў Бабруйску ў 1932 годзе. У лістападзе 1947 года, калі яму было пятнаццаць гадоў, у газеце «Зорка» было надрукавана яго першае апавяданне «Садзім сад». Гэта былі першыя крокі пісьменніка ў вялікую літаратуру. У гэтай газеце ён будзе працаваць яшчэ падчас вучобы на

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Там ён надрукуе свае першыя аповесці «Ляці, Ікар» (1959 г.), «Вецер ірве павуцінне» (1963 г.). У канцы 70-х гадоў выйшлі ў свет яго раманы «Аддаеш назаўжды», «Здабыццё надзеі» і «Вяртанне да сябе». Аб сваім родным горадзе Міхаіл Герчык заўсёды ўспамінаў з асаблівай любоўю: «Наш горад стаіць на лепшай у свеце рацэ Бярэзіне, Бярозе, як яе ласкава называюць па ўсёй Беларусі. Мне і цяпер часам сніцца Бяроза – палоска неба, якая ўпала ў зялёныя зараснікі..., і яркія сонечныя плямы пяшчаных пляжаў. Яе плынь і цяпер у думках нясе мяне далёка-далёка, да суднарамонтнага завода, дзе ў затоках цепляцца старыя, наскрозь пражавелыя баржы, аблепленыя ракавінкамі, яшчэ далей, да белых карпусоў санаторыя над абрывістай стромай, а аблокі плывуць нада мной нейкім адным ім вядомым шляхам. І я прачынаюся ад вострай болі ў сэрцы і доўга баюся адкрыць вочы» [4, 36].

Гэтыя словы сугучныя з адным з вершаў Пімена Панчанкі, чыя біяграфія таксама звязаная з Бабруйскам: «Недзе салавей пяе ў дуброве, // Недзе рэжа хвалі цеплаход. // Кніга вандраванняў і любові, // Я пішу цябе з юнацкіх год. // Вандраваць пачаў я пад Бярозай // Пад гамонку ціхую лясоў, // Радугі стаялі ў вербалозах // Між птушыных светлых галасоў» [1, 22]. У Бабруйску Пімен Панчанка некаторы час працаваў наладчыкам станкоў на дрэваапрацоўчым камбінаце. На гэтым жа камбінаце пачынаў сваю працоўную дзейнасць і вядомы беларускі паэт Сяргей Іванавіч Грахоўскі (1913 – 2002 гг.), на рахунку якога больш за паўсотні кніг лірыкі, вершаў і паэм для дзяцей, аповесцяў і апавяданняў, публіцыстыкі, нарысаў і ўспамінаў. Яму не споўнілася і трынаццаці, калі ўпершыню выступіў з вершамі ў друку. Гэта было летам 1926 года, больш, чым тры чвэрці стагоддзя таму. Будучы школьнікам, Сяргей Грахоўскі не проста заспеў эпоху нацыянальнага адраджэння Беларусі, але паспеў прыкіпець да яе ўсёй душой. Да першага зборніка вершаў дайсці не далі: увосень 1936 года схапілі (паэту было ўсяго дваццаць тры), асудзілі за «контррэвалюцыйную, антысавецкую дзейнасць» і саслалі ў лагер, у тайговую глуш на поўнач Расіі. «Ніхто не паслухаў, ніхто не паверыў, і дзеці забыліся нашы імены...» [1, 56 ] – гэта ён скажа праз дваццаць пяць гадоў, у 1961 годзе, у вершы з невыпадковай назвай «Вера».

І ўсё ж страшэнная д'ябальская сіла не змагла зламаць душу чалавека і паэта Сяргея Грахоўскага. У вершы «Душа» (1964 г.) ён красамоўна засведчыць гэта сам: «Мая душа супраціўлялася, // Бо верыла і тым жыла, // Бо не чарсцвела, не ламалася – // Была такою, як была» [1, 57]. Ён застаўся чалавекам, не страціў дабрыні і любові да людзей, да вечна мілай сэрцу Беларусі. І з гэтай дабрынёй-любоўю ён вярнуўся, нарэшце, на радзіму, цалкам рэабілітаваны і вызвалены. Вярнуўся ў родную Беларусь, у родную беларускую літаратуру.

У 1920 годзе ў вёсцы Плёсы Бабруйскага раёна нарадзіўся беларускі паэт, празаік, перакладчык Мікалай Якаўлевіч Аўрамчык (Мікола Аўрамчык). Ва ўмовах фашысцкага палону (1942–1945 гг.) змог не страціць пачуццё ўласнай годнасці і любові да роднага краю: «Мая Бабруйшчына зялёная, // Здаешся іншым ты малой // З тваёй Бярэзінай хвалёнаю // І з непрыкметнаю Алой. // А мне

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

заўсёды паўнаводнымі // Здаваліся іх берагі, // Былі твае мясціны роднымі, // Куток з маленства дарагі… // Не дзіўна, што тут людзі лечацца… // Куды ні траплю – у Туркі, // Панкратавічы або Лейчыцы, – // Мяне сустрэнуць сваякі. // Панюшкавічы дзесь пад бокам тут… // Змаглі ад гэтуль у жыцці // З якойсці Глушы ці з Пабокавіч // На свет пісьменнікі прыйсці» [1, 69], – як шмат у гэтых радках шчырасці і душэўнай шчодрасці.

Мікола Аўрамчык з'яўляецца аўтарам цэлага шэрагу паэтычных зборнікаў: «Шляхамі дружбы» (1952 г.); «Ключы Жураўліныя» (1960 г.); «Сустрэча былых канагонаў» (1963 г.); «Універсітэцкі гарадок» (1967 г.); «Радовішча» (1976 г.) і інш. У канцы 80-х гадоў выйшлі ў свет празаічныя творы М. Аўрамчыка: раман «Падзямелле» і аповесць «Палон» аб жорсткіх баях, палоне, маральным супрацьстаянні ворагу. Высокай мастацкасцю адрозніваюцца пераклады паэта на беларускую мову твораў Дж. Байрана, А. Міцкевіча, Л. Украінкі, М. Джаліля, Г. Эміна, М. Нагнібяды [3, 87].

Літаратурны летапіс Бабруйшчыны быў бы няпоўным без імя крытыка, літаратуразнаўца, празаіка, кінадраматурга, драматурга, публіцыста, члена-карэспандэнта АН БССР, доктара філалагічных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа Аляксандра Міхайлавіча Адамовіча (Алеся Адамовіча). У аўтабіяграфіі А. Адамовіч адзначаў: «Кожны, хто піша, знаёмы з тым галоўным штуршком у жыцці, які робіць яго літаратарам. Для адных гэта была рэвалюцыя, Грамадзянская вайна... Для мяне і маіх аднагодкаў – Айчынная вайна ... " [5, 18]. Убачанае і перажытае ў партызанах паўплывала на творчую пазіцыю пісьменніка, знайшло адлюстраванне ў мастацкіх творах: «Вайна пад стрэхамі» (1959 г.); «Сыны ідуць у бой» (1963 г.); «Хатынская аповесць» (1972 г.); «Я з вогненнай вёскі» (1975 г.); «Блакадная кніга» (1979 г.); «Карнікі» (1980 г.) [2, 93].

Яркім, гераічным і імклівым было жыццё Алеся Адамовіча. Тая Глушанская зямля, якую ён так любіў і куды стараўся прыязджаць як мага часцей у бацькоўскую хату пад родныя бярозы, дала апошні прытулак пісьменніку. Ён пахаваны на могілках у в. Дойнічава Бабруйскага раёна.

У Бабруйску нарадзіўся Эфраім Севела (1928–2010 гг.) – знакаміты акцёр, пісьменнік, кінасцэнарыст, кінарэжысёр. Яго кніга апавяданняў «Легенды Іваліднай вуліцы» прысвечана роднаму гораду, успамінам дзяцінства.

Абрам Рабкін (1925–2013 гг.), мастак, пісьменнік, свайму роднаму гораду прысвяціў аповесці: «Уніз па Шашэйнай» (1998 г.), «Усё пачыналася ў Бабруйску» (2003 г.), «Вакол вайны» (2013 г.).

Літаратурныя традыцыі г. Бабруйска прымнажаюцца і сёння. У горадзе працавалі такія сучасныя паэты, як Святлана Басуматрава (1946–2016 гг.), Уладзімір Малевіч (1938 –1998 гг.). Існуе аддзяленне Беларускага літаратурнага саюза «Полацкая галіна», у склад якога ўваходзяць Богдан Лема, Аляксандр Супей і іншыя.

Праходзяць гады, у літаратуры з'яўляюцца новыя імёны, але не перарываецца сувязь часоў, і ўжо новае пакаленне бабруйскіх літаратараў услаўляе нацыянальную самабытнасць беларусаў, вернасць роднаму краю.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Літаратура:
1. Адданасць: Вершы / Укл. В. Спрынчан. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – 154 с.
2. Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т.1 / Рэдкал.: Пашкоў Г.П. і інш. – Мінск: БелЭН, 1996. – 638 с.
3. Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т.2 / Рэдкал.: Пашкоў Г.П. і інш. – Мінск: БелЭН, 1996. – 653 с.
4. Давіч, М. Клічу ў будучыню: пра Бабруйск і бабруйчан / М. Давіч. – Бабруйск, 1996. – 152 с.
5. Казека, Я. 54 дарогі. Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / Я. Казека. – Мінск, 1963. – 552 с.
6. Шушкевіч, С.П. Вяртанне ў маладосць : успаміны і нататкі / С. П. Шушкевіч. – Мінск : Беларусь, 1968. – 227 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова